АПЛАДЫСМЕНТЫ

# МАЛАДЗЕЧАНСКІЯ ПРЫЗЁРЫ




*Прыз імя Уладзіміра Мулявіна Аляксандр САВАНЕЦ атрымаў з рук удавы музыканта Святланы ПЕНКІНАЙ-МУЛЯВІНАЙ.*

Адной з цэнтральных падзей XVI Нацыянальнага фестывалю песні і паэзіі, які прайшоў у мінулыя выхадныя ў Маладзечне, стаў конкурс маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні. Штогод форум адкрывае сярод яго ўдзельнікаў новыя імёны, даючы пуцёўку на вялікую сцэну пачынаючым артыстам.

Адразу дзве адзнакі – дыплом лаўрэата І ступені і ганаровы прыз імя Уладзіміра Мулявіна атрымаў сёлета прадстаўнік Мінскай вобласці Аляксандр Саванец. Вакалам Аляксандр займаецца восем гадоў. Ён скончыў Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў, цяпер – выпускнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Другое месца дасталося Ніне Жукоўскай (Мінск) і Марыне Бараноўскай (Віцебская вобласць). Уладальнікі трэцяга месца – Аляксандр Ласоўскі (Гомельская вобласць), Ксенія Бучылка (Гродзенская вобласць), Аляксандра Вітушкіна (Віцебская вобласць).

Гран-пры конкурснае журы на чале з народным артыстам Беларусі Міхаілам Фінбергам вырашыла сёлета не прысуджаць.

Дарэчы, прызавы фонд конкурсу даволі важкі. Гран-пры – 25 мільёнаў 200 тысяч рублёў. Першая прэмія – 21 мільён рублёў, другая – 16 мільёнаў 800 тысяч рублёў і трэцяя – 12 мільёнаў 600 тысяч рублёў.

У заключным этапе конкурсу ўдзельнічаў 21 артыст – па тры прадстаўнікі ад кожнай вобласці і горада Мінска. Маладыя артысты спявалі пад фанаграму «мінус 1» і ў суправаджэнні Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра. Асаблівасць гэтага творчага супрацоўніцтва – выкананне твораў беларускіх аўтараў на беларускай мове.

Сёлетні Нацыянальны фестываль песні і паэзіі быў прысвечаны 75-годдзю з дня нараджэння народнага артыста СССР і Беларусі Уладзіміра Мулявіна. У гонар юбілею ў Маладзечне прагучала прэм'ерная праграма Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра, складзеная з твораў славутага музыканта, адбыліся паказ спектакля «Пясняр» Рускага тэатра імя М. Горкага, выступленне юных выхаванцаў Нацыянальнага цэнтра музычных мастацтваў імя Уладзіміра Мулявіна пад кіраўніцтвам Святланы Стацэнка.

**Ірына СВІРКО**
svirko@sb.by



*Песенную спадчыну Уладзіміра Мулявіна прадставіў Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр.*

Фота БЕЛТА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ